ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнаго № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 г.

За 1 м	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м	За 6 м.	За 7 м	За 8 м	За 9 м.
1 р	2 р.	3 р	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска напісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць

На ліставанне, перасылку рукапісау і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захарауск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 30. 1917 г. Нядзеля. Выходзіць двойчы на тыдзень. 19 лістапада 1917 г. № 30.

Таварышы і грамадзяне!

Выбары да Устаноўчаго Сойму

№ 13. па Міншчыні і Віленшчыні адбудуцца 26, 27, 28 лістапада. **№ 13.**

Падавайце голас за сьпісак

Беларускай Социялістычнай Грамады.

Шлях паратунку.

Расіі німа, і толькі па старой звычцы мы шукаем рэальнаго зьместу там, дзе засталася фікцыя. Расійская дэмакратыя, якая с сваіх партыяў і грамадзкіх арганізацыяў выдзеляла правіцельство старога і новага ураду, обанкрутовала, як дзяржаўна-творчы арганізм. Вялікаруская нацыя, падзеямі апошняго часу, выявіла поўнае ніуцтво у справі дзяржаўнаго здбудавання. Большэвізм—гэта культурны і грамадзкі барбарызм, а тым часам, вялікарускае грамадзянство, ні глядзючы на сваё абурэнне, нічога зрабіць з ім ні можа. Грамадзкі лад і дзяржаўная гаспадарка зруйнованы да шчэнту, а расійская дэмократыя, ахоплена сьмяртэльным паралюшам заніпаду, толькі скардзіцца, ные і сударожна трымаецца за зьгніўшы слуп маскоўскаго цэнтралізму. І калі цяпер ні ужыць усіх патрэбных заходаў дзеля устанаўлення сталаго ладу і дзеля уласнаго захавання дык хваля руйнуючай анархіі захлыне сабою усіх і усё. Бачучы гэта, усе народы і паособныя абласьці Расіі горача завінуліся каля адбудавання уласнаго жыцця, маючы на увазі зноў абьеднаць Расію на грунці фэдэральнаго ладу. І Генэральны Сэкрэтарыят Украіны узяў на сябе ініцыятыву арганізаваць фэдэральны урад, каторы можа утварыцца у нас, на Беларусі, ў г. Магілёві. Гэта ядыны шлях паратунку,—іншаго і лепшаго выйсьця с цяперашняго становіска німа. Большэвіцкі урад народных камісароў, каторы ні прызнаецца ні сваімі, ні чужымі, правамоцным лічыцца ні можа ды й ні здацен ён на творчую дзяржаўную работу, як і уся, наогул, вялікаруская дэмакратыя. «Суждены имъ благіе порывы, но свершить ничего не дано.»

«Балоцістая Архангельшчына і лясістая Волагодшчына,—піша «Нова Рада»,—ні гралі у гісторыі Расіі ніякай вызначнай ролі і ні будуць граць, і таму да бажання Украіны, Каўказу, Дону, Кубані, Бэсарабіі,—гэтых найбагатшых краёў, мусіць прылучыцца Велікаросія, якої Надволжскі край ні прагодаваць, ні уратаваць ні зможа. Вялікарускі народ страціў дзяржаўнае кіраўніцтво і мусіць цяпер, нараўне з іншымі, пасланць сваіх прэдстаўнікоў у Фэдэральную Усерасійскую Раду, якая выбярэ цьвёрды і пэўны Урад, каторы прызнаюць усе краё і усе народы.»

Я. Л—к.

Першая Сэсія „Рады Народаў“ у Кіеві

Ад 24 да 27-го кастрычніка у Кіеві адбываліся пасядзення першае сэсіі «Рады народаў», абранае на зьездзі народаў. Былі прэдстаўнікі ад беларусаў, украінцаў, латышоў, эстонцаў, грузінаў, крымскіх татар і іншых народаў.

Ніспакойны час і многа іншых прычын перашкаджалі членам «Рады Народаў» быць на сэсіі Рады, як напрыклад, казаком, каторыя пра гэта раней паведамілі і прасілі ні уважаць гэта наўмысным; і жыды, якія ні маглі быць на сэсіі, праз тое, што ні управіліся іх партыі падзяліць паміж сабою тых 4-х мейсц, што належаць ім у «Радзі Народаў.» І наогул, дзякуючы ціперашнім падзеям, якія падчас сэсіі пачаліся у Кіеві, сэсія прайшла мала прыкметна і ні зьвярнула на сябе належнае увагі грамадзянства.

Першы дзень работы сэсіі пашоў на праверку мандатаў прэдстаўнікоў, апрацаванне парадку дзеннаго і на абгаварэнне справы каоптацыі дзе-якіх членаў. Потым былі даклады прэзыдзіума і паведамлення з мейсцаў, каторыя далі агульны нарыс таго, у яком ціпер становішчу апынуліся народы Расіі. У большасьці гэтых народаў праца арганізавання іхніх народаў ідзе добра і дае жаданыя скуткі. У іншых прызначаны нават дні краёвых устаноўчых соймаў, або краёвых зьездаў, як напрыклад, у эстонцаў Эстляндзкая Рада. Малдавяне паведамілі, што іхні вайсковы зьезд абвесьціў аўтаномію Бэсарабіі. Амаль ні кожны народ праводзіць нацыяналізацыю войска. Апрач таго, латышы і эстонцы дакладна апаведалі пра тую руіну, якая зроблена у іхніх краёх праз блізкасьць фронту рэквізыцыямі расійскаго войска і грабункамі.

У справах, што разважаліся на сэсіі посьля дакладаў і паведамленняў з мейсц, Рада Народаў ухваліла адпаведальныя пастановы, важнейшыя с каторых гэтакія:

1) Абмяркаваўшы у сваіх пасядзэннях 24-27-го кастрычніка пытанне пра «Всероссійское Учредительное Собраніе», «Рада Народаў» ухваліла прычыніцца да выбароў;

2) Дзеля абьеднання працы усіх дэпутатаў, што згаджаюцца с поглядамі Зьезду Народаў на фэдэратыўнае адбудаванне Расіі і дзеля абстаівання фэдэратыўнаго прынцыпу на «Всероссійскомъ Учредительномъ Собраніи»,—«Рада Народаў» уважае патрэбным утварыць камісію з дэпутатаў;

3) Выслухаўшы заявы сваіх членаў, «Рада Народаў» даручае мейсцовым арганізацыям паруніцца са склікеннем нацыянальных і краёвых устаноўчых соймаў;

4) Уважаючы патрэбным абьеднанне арганізацыяў народаў Расіі, «Рада Народаў» ухваліла утварыць пачатковы гурт з украінскаго вайсковаго Камітэту і мейсцовых вайсковых арганізацыяў для склікання конфэрэнцыі прэдстаўнікоў нацыянальных вайсковых частак;

5) Рада народаў, прымаючы на увагу паведамленне латышоў і эстонцаў пра безладзе і гвалт, якія чыняцца дзе-якімі часткамі расійскаго войска у прыфронтовых мейсцовасьцях, ухваліла прасіць нацыянальныя вайсковыя арганізацыі узяць пад сваю абарону мейсцовую людносьць і паведаміць пра гэта глаўнакамандуючых фронтамі і усіх паслоў хаўрусных дзяржаваў;

6) Заслухаўшы заяву прэдстаўнікоў эстонцаў і латышоў пра рэквізыцыю усіх харчовых запасаў на Эстляндшчыні, Курляндшчыні і Вітэбшчыні, чым людносьць краю даводзіцца да сапраўднаго голаду, «Рада Народаў» ухваліла протэставаць і зьвярнуць увагу правіцельства на патрэбу ніадкладнаго скасовання распараджэння пра рэквізыцыю;

7) «Рада Народаў» уважае, што посьля склікання мейсцовых устаноўчых соймаў павінен быць скліканы Конгрэс Народаў для пагоджэння працы мейсцовых устаноўчых соймаў і згоды у супольных справах, каторыя будуць паварушаны на «Всероссійскомъ Учредительномъ Собраніи.»

Падзеі апошняго часу.

Скуткі большэвіцкаго паўстання.

Паўстаннем у ноч з 24 на 25-го кастрычніка большэвікі скінулі каоліцыйны, напоўсоцыялістычны урад і забралі уладу ў сваё рукі, утварыўшы т. званае «Рабочее и крестьянское правительство.» Разумеяцца, што гэта байкі, калі большэвікоў называюць зраднікамі і нямецкімі шпігамі. Такімі байкамі і ганебнымі плёткамі хітрыя людзі звыклі палохаць дурных і скваппых на таемныя гаворкі грамадзян. Такія людзі гатовы распусьціць чуткі, што большэвікі, заміж гарэлкі, пьюць кроў і закусваюць маленькімі дзяцьмі. Людзі, каторым ні пад сілу ідэйнае змаганне с сваімі супраціўнікамі, шмат на што адважваюцца. Прыпамятайма, як казалі пра рэвалюцыянэраў, што яны подкуплены жыдамі, а потым сталі шырыць чуткі пра японскія мільёны. Тут да рэчы нагадаць, як даўней паганцы у Рымі казалі на хрысьціян, што яны пьюць людзкую кроў, а с часам гэтыя ганебныя нагаворы хрысьціяне, добра ўмацаваўшыся, перакінулі с сваё галавы на жыдоўскія плечы, і цяпер сярод простаго беларускаго народу істнуе лягэнда пра жыдоўскую мацу.

Распускаючы нагаворы пра хрысьціян, паганцы мелі на увазі тое, што хрысьціяне прычашчаюцца цела і крыві Хрыстуса, а цяперашнія выдумшчыкі пра большэвікоў, ні разумеючы іх ідэёвых заданняў, ганебна тлумачаць погляд большэвікоў на вайну і адносіны да нямецкаго пролетарыяту. З большэвікамі можна і трэба змагацца у наш нібязпечны час усімі заходамі, але бэсьціць людзей і плясьці на іх уселякую брыдоту—ні гожа; гэта значыць—пляміць самых сябе. З большэвікамі трэба змагацца дзеля таго, што яны рыхтуюцца завесьці у дзяржаві такі грамадзянскі лад, да катораго людзі яшчэ ні дарасьлі. Уводзіць у нас, пры нашай гаспадарскай і грамадзкай адсталасьці, соцыялістычны лад,—гэта усё роўна, каб хто захацеў з малога хлопца раптам зрабіць дзяцюка ды стаў-бы цягнуць яго за вушы ўверх. Разумеяцца, апрач калецтва, з гэтаго нічога-б ні вышло, А, тым часам, большэвікі рэбяць нешта падобнае з дзяржавай расійскаю, і мы бачым, што скуткам іх зоўчаснай чыннасьці пабольшваецца безлад, калатніна і заніпад, хоць яны шчыра жадаюць дабра працоўнаму народу, але гэтак, як шкадавала адна жаласьлівая бабка свайго хвораго на тыфус унука. Унук плакаў ды усё прасіў даць яму бульбы, каторае пры тыфусу ні можна есьці. Бабуля зьмілавалася ды дала, а унук зьеў ды памёр.

Нам, беларусам, трэба асабліва уважна ставіцца да уселякіх цёмных нагавораў, бо ці раз чулі мы, як ворагі нашы на рожныя лады бэсьцілі нас, называючы сьвятую справу адраджэння нашаго народу польскаю інтрыгаю, каторая падтрымліваецца коштам тутэйшых паноў дзеля прылучэння, нібы-то, нашае бацькаўшчыны да Польшчы. Чаму да Польшчы ганебна прылучацца і дзе яны чулі, што беларусы жадаюць да каго-нібудзь прылучацца,—яны гэтага ні тлумачаць. Ні тлумачаць яны і таго, што у Польшчы жыве гэтакі самы працоўны народ, як і мы,—ні горшы і ні лепшы за расійцаў ці які іншы народ. Іх гэта мала абходзе, але гадаўё гэтае добра кеміць, куды гразёю шпурляе. Яны разумеюць, што нашае селянство, дзякуючы прыкрым гістарычным умовам, звыкло разумець пад палякамі мейсцовых паноў-перакінчыкоў і усю ганьбу і злосьць да паноў-землеўласьнікаў переносе на увесь польскі народ, ні ведаючы яго і абражаючы людзей саўсім ні вінаватых. Так вігодныя людзі каламуцяць воду. Ім-бы толькі запалохаць і пасварыць людзей, пашанцовало-б толькі растачыць паміж іх калатню, а ужо потым, стоючы збоку, яны скарыстаюць. Справа тут ні ў палякох і ні ў расійцах,—ворагам нашым наогул ні падабаецца рух нацыянальнаго адраджэння нашаго народу, а яны ведаюць, што беларусы ні да кога ні захочуць далучыцца, бо ужо—калі на тое пайшло—дык лепш мы самі каго-небудзь прылучым да сябе, чым меліся прылучацца да каго.

Усё гэта, вышэй памянёнае, сьведчыць пра тое, як уважна трэба адносіцца да таго, што чуткамі і нагаворамі пашыраецца, і перш, як даць веры, трэба справу уважна разглядзіць, зразумець, абмяркаваць, а ужо потым даваць той ці іншы свой прысуд. Мы, беларусы, неяк заўсюды усіх слухалі, з усімі нібы-то згаджаліся, а рабілі па-своему. Гэта добрая прыкмета, яе трэба шанаваць. Дык падтрымаймо-ж свой характар і тут, у справі большэвіцкаго паўстання, разглядаючы падзеі апошняго часу.

Яшчэ ні умацаваўшыся у ўласьці і скрозь змагаючыся за уладарство, большэвікі, тым часам, адразу прыступілі да соцыяльнаго [грамадзкога] законадаўства і зьмен у соцыяльным жыцці людзей. Так, былі выданы дэкрэты: аб скасаванні ўласьнасьці на панскія землі і аб перадачы зямлі зямельным камітэтам без выкупа; аб прамысловых, фабрычна-заводзкіх зьменах, аб кватэрным пытанню і, паміж ім-

БЕЛАРУСЫ-ВОІНЫ ЗАХОДНЯГО ФРОНТУ! ВЫБІРАЮЧЫ ДА

пым, славэтны дэкрэт аб замірэнню.

Справедлівым, або дэмакратычным мірам большэвікі лічаць нібаўны мір, мір без аннэксіяў і кантрыбуцыі, т. е. без выплаты ваенных страт і без захапленння чужої зямлі і без прымусоваго, гвалтоўнаго прылучэння чужых народаў. Гэтакі мір прапануюць яны зрабіць усім ваюючым народам нібаўна, выслаўляючы гатоўнасьць зрабіць зараз-жа, без жаднага адкладу, усе рашучыя шагі наўперад, да канечнае ухвалы усіх сталых умоваў міру поўнамоцнымі зборамі народных прэдстаўнікоў усіх краёў і усіх нацыяў. Але разам с тым, большэвіцкі урад абвесьціў, што ён саўсім ні лічыць вышэй памякёных умоваў міру ультыматьўнымі [абвязковымі], і згаджаецца разгледзіць і іншыя прапазыцыі міру, дамагаючыся толькі яснасьці і безумоўнаго вылучэння нізразумеласьці і жаднай таемнасьці у прапазыціях міру.

На моцы пракапання самых большэвікоў, выходзе, што дэмакратычны мір,— мір без аннэксіяў і кантрыбуцыі, магчым толькі тагды, калі у ва ўсіх ваюючых дзяржавах пачнецца соцыяльная рэвалюцыя, або паўстанне працоўнаго люду проці сваіх угнетацялеў. Гэта будзе тагды, як увесь сьвет, усе народы прыдуць к апошняму этапу капіталістычнаго ладу і стануць у сенях далёкаго сьветлаго царства будучыны, царства с о ц ы я л і з м у. Ведаючы, напрыклад, што робіцца у Гэрманії і што заграніцаю ні чуваць пра рэвалюцыю, можна с пэўнасьцю сказаць, што такога міру прыдзецца чакаць больш, як перамогі над немцам да «пабеднаго канца.» Ясна, што такога міру мы ні дачакаем. Каб утварыць мір на іншых варунках, трэба адтрымаць згоду усіх ваюючых дзяржаваў і каб ваюючыя дзяржавы прызналі большэвікоў законным і правамоцным расійскім правіцельством. Тым часам, на большэвіцкі поклич намірыцца, немцы адказалі, што яны ні могуць гэтага зрабіць, ні ведаючы паглядау на гэта усей Расії, а нашы хаўрусьнікі награжаюць раздзелам Расії. Такім чынам, пры большэвіцкім урадзі канец вайны адсунуўся яшчэ далеі, як быу да гэтага часу.

Што датыча раптоўнаго скасавання уласнасьці на землю, то гэта награжае страшэнным эканамічным крахом. На грунці зямельнае уласнасьці пабудованы зямельныя банкі з міліярднымі конгамі, с каторымі цесна зьвязаны соткі фабрык, заводаў з дзесяткамі тысяч рабочых і уселякаго служылаго люду. Усё гэта павінна будзе прыпыніцца, пойдзе на ліквідацыю і зруйнуе дзяржаўную гаспадарку да шчэнту. І каб гэты зямельны дэкрэт увайшоў у жыцце, дык ці здолаўбы край калі небудзь направіцца і ці ні спаткала-б яго доля жабрачая, доля Пэрсії і іншых, ёй падобных, краін? А покі што, мы бачым, што гэты ніпрадуманы дэкрэт аб зямлі, апроч шкоды для самога народу, нічога добраго ні даў. Пайшлі пагромы, грабункі і безглуздае нішчэнне усяго грамадзкога дабра. Сякуцца без ладу лясэ,—краса і багацце нашаго краю, паляцца і руйнуюцца да шчэнту маёнткі, гістарычныя будынкі і культурныя здабыткі. Народ, як-бы пракапаўшыся, што абецанка—цацанка, пачынае ў росначы бурыць тое, на што пасягае, і, такім чынам, руйнуе той грунт, на каторым павінно будавацца новае лепшае жыцце.

Большэвіком удалося забраць уладу ў свае рукі толькі дзякуючы таму, што яны сваімі дэмагогічнымі абецанкамі згуртавалі каля сябе частку натомленых вайною салдатаў, матросаў і рабочых, жадаючых ніадкладнаго міру. Тым часам, усё грамадзянство, апрач тых, хто актыўна прычыніўся да наўстання, ні згаджаецца прызнаць большэвіцкаго ураду, захапіўшаго уладу дзякуючы загавору і гвалтоўству. Началася грамадзкая вайна. Проціў большэвікоў паўсталі і усе тыя соцыялісты, каторыя лічаць заўчасным завядзэнне цяпер соцыялістычнаго ладу і прызнаюць німагчым парадак пролетарскай дыктатуры. Салдацкімі штыкамі і узброеными рабочымі, падчас грамадзкай утомленнасьці, можна рабіць загаворы і скідаць урады, накладаць цэнзуры, рабіць арэшты, наводзіць страхоцце, але упраўляць дзяржавай німагчыма. Ні які штык у сьвеці ні можа прымусіць да працы усіх банкіраў, фабрыкантаў, чыноўнікаў, калі яны самі таго ні захочуць. І мы бачым, што ахапіўшы усіх саботаж [моўчалівае ухіленне ад работы] прывёў да агульнаго безладзя, анархії, безработця і голаду і руйнуе дзяржаўную гаспадарку да шчэнту.

Большэвізм спакусіў цёмныя, нісьвядомыя масы моцнымі абяцанкамі скончыць вайну, надарыць зямлёю, накарміць галодных, усьцешыць бяздольных, прыкыніць калатніну, устанавіць парадак. Тым часам, нічога гэтаго ён зрабіць ні здолае, і хутка усе адхіснуцца ад яго. Тагды урад Леніна—Троцкаго разваліцца, як паперовая хатка,—гэта напэўна. Многа нарабіў шкоды большэвізм, а яшчэ большая нібязпека чакае нас наперадзі. Народ утаміўся і пяражыў усе стадыі соцыялістычных абяцанак. Гэтыя абяцанкі нічога, апрач утомы і зьняверра, яму ні далі. Большэвізм—гэта астатняя хваля рэвалюцыйнаго руху,—далей пасувацца некуды. Ад гэтаго часу рух рэвалюцыйнаго поступу пачне здаваць назад і— хто скажэ, гдзе гэтае адступанне назад супыніцца? Хто можа быць пэўным, што ні зьявіцца у гэты цяжкі час грамадзкаго заніпаду які-небудзь Напалеон і ні пастараецца завесьці парадак на свой густ і разуменне? Ні дарма-ж кажуць, што большэвіцкае поўстанне— загібель для рэвалюцыі. І народ ужо ні зможа змагацца з Наполеонам. Гэта відаць с прыкладу большэвіцкаго паўстання. Проціў большэвізму абурылося усё грамадзянство і само большэвіцкае паўстанне адбылося за дапамогаю нівялічкіх гурткоў салдатаў і узброеных рабочых, а, тым часам, тысячы уселякіх арганізацыяў, як с.-р., селянскія хаўрусы, каопэратывы, пачтовыя і залезнадарожныя хаўрусы і інш. ні маглі спыніць наўстання. Гэтае зьявішчо сьведчыць пра тое, што народ страшэнна утаміўся, і уладу у Расії можа захапіць кожны, хто патрапіць згуртаваць каля сябе узброенных людвей.

Ратунку ад контр-рэвалюцыі трэба шукаць у нацыяльным адбудаванні свайго жыцця. Фінляндзія гэта зразумела даўно, а братняя нам Украіна зрабіла гэта апошнімі днямі, абвесьціўшы Украінскую Рэспубліку.

Я. Л—к.

Ігнат Буйніцкі.

(Пасьмертны успамін.)

Так нідаўна яшчэ было цёмна, злыя ветры губілі добрыя засевы, і, пад ніпэўным небам, накладаючы усе свае сілы, працавалі нашы лепшыя людзі.

Ні ашчаджаючы сілаў, ні шкадуючы нават жыцця свайго, несьлі яны людзям, у тыя цяжкія годы, вестку аб Беларусі, як Лазар ўстаючай змёртвых, аб Беларусі, у пакуці здабываючай сабе права на самабытнасьць і жыццё ў сямьі іншых народаў.

Ні многа іх было, але паўсюдых: адны з іх у забрэсьневеўшых кнігах шукалі гістарычнай праўды і забытай людзьмі справядлівасьці. Другія у звонкіх пекных вершах вылівалі боль сваю і журбу, трэція гарачую любоў да бацькоўшчыны ўсілаваліся прышчапіць сваім вучням у народных школах, разсеяных па самых глухіх кутках Беларусі.

З іх кпілі, ім ні верылі, ні дапушчаючы, што «простая мова» бажала-б мець сабе правы грамадзянства.

Горкім і безканечна цяжкім было іх жыццё.

Але с паміж іх знайшоўся адзін, што з беларускай гутаркай, у бедным рэпэртуару, адважыўся ўзыйсьці на сцэнічныя ўзмосткі і гэтым палажыў пачатак Беларускаму тэатру, дадаўшы імпэту нацыянальнай драматычнай творчасьці. Тым пачынальнікам сучаснаго беларускаго тэатру быў Ігнат Буйніцкі.

Хто хоць крышку дасьвядчоны аб цяжкай долі дзеячоў провінцыяльнаго тэатру, той зразумея, у якіх цяжкіх варунках прыходзілося працаваць Буйніцкаму. За ім сачылі, ў кожным слові яго на сцэні і па-за ёй, шукалі калі ні беларускаго сэпаратызму, то, ў найлепшым выпадку, вольнадумства. Уся наша труппа (састаўленая, трэба сказаць, із шчыра дэмакратычнай моладзі) узята была над увагу паліцэйскаго дагляду.

Траплялися і бажаючыя выкарыстаць беларускіх артыстаў для сваіх праграм, для сваёй агітацыі. «Минское Слово» прыслало на спэктакль у Мінску 27 чэрвеня 1911 году свайго асьведаміцеля. Але шмат сілы, ахвоты і цярплівасьці было у пана Ігната. Адтрымаўшы дазваленне губэрнатара на выставы беларускаго тэатру па усёй Міншчыні, духоўна падтрымоўваны «Нашай Нівай», у канцы мая 1911 году Буйніцкі прыежджае у Мінскую губ., набірае тутака новых артыстаў у сваю труппу, ядро каторай прывёз с сабою, і адпраўляецца ў мандроўку па беларускіх мястэчках і гарадох. Капыль, Клецк, Несьвіж, Цімковічы, Ляховічы,—вось пункты, у якіх першы раз пачулі на сцэні беларускую гутарку. Пасуваючыся далей, пашыраючы сваю чыннасьць, Буйніцкі уладжывае выставы у Слуцку, ў паветовай Вілейцы, у Мінску. Ні лёгка апісаць пачуцця, каторыя агарталі прыходзіўшых на беларускія выставы. Іх ніцярпліва чакалі, да іх гатаваліся з радасьцю, нават з нейкай набожнасьцю. Успамінаюцца выпадкі, калі стогодніх старцаў прыводзілі з вёсак, і яны плакалі сьлязьмі радасьці. Успамінаюцца моманты пад'ёму творчасьці, пазваляўшыя слабым у сцэнічным мастацтве выконаўцам дасягаць вялікае сцэнічнай праўды.

ВАРОЖБА.

(Засьцянковая аповесьць).

Бліжыцца поўнач. У гэтай парэ
Сон пахаджае па панскім дварэ.
Сьпяць, пакончаўшы звычайную працу;
Чэлядзь ў пекарні, паны у палацу;
Толькі стары вартаўнічы Ігнацы
Ходзіць с клякоткай і пінкай сваёй:
Двор сьцяражэ ад людзіны ліхой.

Ходзіць стары і мурмоча пад нос:
— «Ну і праклятый-ж сягодня мароз!
Новы кажух прабірае, пся вэра,
Бытцам кажух—ні кажух, а папера!
Брэша, ні зломіць старога жаўнера,—
Панна Эміля, хай Бог ёй аддасьць,
Вызваліць з гора, ні пусьціць прапасьць.

Ценгля, як толькі начнецца цямнець,
Зараз пальнаўкі с кухні нясець,
Міла глядзіць і ласкава сьмяецца:
— Хочацца можа, Ігнацы, пагрэцца?—
Гэткі парадак ні ўсюды вядзецца!
Добрае сэрцо! Павет абыйсьці,
Роўную панні бадай, каб знайсьці...»

Адвэнт на сходзі. Яшчэ да Каляд
Тыдзень астаўся адзін акурат.
Неба у зорках і кожна з іх зьяе,
Месяц зялёны свой сьвет пасылае,
Легкі маровік за шчокі хапае,
Сьнег пад нагамі прыемна рыпіць,—
Ведае варту Ігнацы,—ні сьпіць.

Панна Эміля, тым часам, сабе
Вечар праводзіць у нейкай журбе:
Нейкія брэдні плятуцца дзяўчыні,—
Бытцам яна ні у дварэ ахмістрыня,
Бытцам яна ні жывець ў ахвіцыні,
Бытцам яна німа ведама хто.
Хочацца сэрцу ніведама што.

Успомніць мамульку, татульку, свой дом,
Успомніць сябе нівялічкую ў ём,
Старшаго брата і няньку-бабульку,
Тэклю, Агатку, Гацульку, Аршульку,
Даўных равесьніць... кароўку Рабульку...
Дзе яно ўсе? І ні вернеш тых дзён,
Зьнікло, як дым, расплылося, як сон!...

Страшна і ўспомніць далёкі той год,—
(Чорным яго называе народ)—
Пошэсьць с касою па сьвеці хадзіла,—
Панну Эмілью сіроткай зрабіла.
Родных, сямейку зямлёю накрыла
Доля, пінначэй, у яе ўсё руцпэ:
Узялі паны гадоваць пры дачцэ.

Устане, паходзіць і сядзе ізноў,
Бьець у галоўку гарачая кроў;
Нейкія ў сэрцу парваліся тамы,
Твар то збляднея, то зробіцца ў плямы...
Стане прад Маткай Сьвятой з Вострай Брамы,
Просіць: «Прачыстая, згінуць ні дай,
Горо адкінь, ад бяды захавай!».
Ручкі заломіць і сьлёзы цякуць...
Новыя думкі ізноў набягуць,
Жыцце у людзях сабе выкладае.
Цяжкае жыцце! Хаця спагадае
Маткі заступніца,—пані старая,
Пан, як бы родны,—нівесяла жыць!
Час у жалобі, ў маркоці бяжыць.

Хочацца сэрцайку ласкі ні той,—
Хочацца спогадзі панне другой...
Тэкля, Аршулька, Ганулька—малжонкі.
Шлюбныя носяць на пальцах пярсьцёнкі...
Моліцца панні да уласнай патронкі:
— Панна сьвятая, ты неба ўмалі,
Вернаго друга мне ў жыцці пашлі!

Потым усьміхнецца прыгожа... Каму?
Ведама,—пэўне, яму аднаму.
Рожы цьвітуць на бялюсінькім твары.
Што-ж тут за цуд і чые-ж гэта чары?
Праўду сказаць?... Вінаваты гусары.
Ну, хоць ні ўсе, дык прынамсі адзін
Панні прычынай маркотных гадзін.

Статны, прыгожы,—праўдзівы жаўнер—
Гляне—як сокал! Які-ж кавалер!
Майстар на жарты які, на хіхоты.
Як удаецца ў шабунькі, ў залёты,
Лесткі пушчаць,—навучыся ў яго ты!
Як ён часамі умея глядзець.
У танцу які!—ні пазволе сядзець!

Ручку як сьціснне, на вуха шапне
Слоўцо такое, што й сэрцо замрэ!
Шкода, нідоўга яны пастаялі...
Толькі тры дні усяго балявалі
Гэтта, ў дварэ, і паехалі далей.
Рушылі ў Вязьму, а стуль пад Маскву.
Чуіць паненка, маўляў, па яву,

Як прад ад'ездам ён цяжка ўздыхаў:
Помніць—навекі аб ёй прысягаў,
Як ад'ежджаючы, бачыць, скланіўся...
Праўда-ж? Ці помніць? Ці можа забыўся?
Любіць? Ні любіць?.. У другую ўлюбіўся?
Можа ўдаваў закаханне на жарт?
— Трэба аб гэтым спытацца у карт!

Праўда, што адвэнт, і грэх варожба.
Што-ж—калі гоніць ў сухоты журба!
— Бог міласэрдны ніхай выбачае...
Панна Эміля ў красэлка сядае,
Талью картуе, шэсьць карт выкладае,
Сёмая карта кладзецца пад ніз.
Хітры пасьянс пачынае: Маркіз.

Любіць? ні любіць? Любіў? ні любіў?..
Верным астаўся?.. Ці верным ні быў?—
Шэнча паненка. Пасьянс збуптаваўся..
Дзе ж той чырвовы кароль падзеваўся?
Мусіць ні любіць!.. не, гэты ні ўдаўся!..
— Іншы спрабую цяпер разлажыць...
Час памаленьку бяжыць, ды бяжыць.

Поўнач прайшла. У дварэ пятухі
Раз прапеялі с-пад цёплай страхі.
Крайчыкам месяц з-за туч выглядае.
Панна Эміля варожб ні кідае,

УСТАНОУЧАГО СОЙМУ ГАЛАСУЙЦЕ ЗА СВОЙ СЬПІСАК № 4.

Буйніцкі гадаваў у нас веру у важнасьць нашай культурнай задачы, у сьвятасьць ідэі, да якой мы ішлі. Заўсёды перад намі была сівая, але вечна юная галава пана Ігната, яго жывы твар. Спачынку ён сабе ні дазваляў: чытаў са сцэны творы паэтаў беларускіх, скакаў у танцах, выступаў на тэатральных выставах, выясьняў публічнасьці мэту і заданьні беларускага тэатру. І за ім і першымі беларускімі артыстамі у сьлед ішлі гарачая любоў і добрыя пажаданні, якія збыліся.

То там, то сям у гарадох Беларускіх высокія салі напоўняюцца публікай, якая ні для выкпіваў прыходзіць слухаць беларускую гутарку, ўспыхіваюць са сцэны адсьветныя агенькі і льюцца аттуль жыватворчыя словы.

Мэта пачынальніка беларускага нацыянальнаго тэатру дойдзена: тэатр мае моцны грунт, ён адваеваў народную любоў.

І калі ёсьць гэта любоў, што зьяўляецца падмуроўкай росквіту беларускай драмы, то гэта скутак афярнае начэснай працы нябошчыка Ігната Буйніцкаго і найлепшае прызнанне заслуг яго перад родным краем. Буйніцкаго і яго першых супрацоўнікаў зьмянілі новыя, маладзейшыя сілы і можна было бачыць, як радасна пазіраў ён на іх, угадваючы ім сьветлую і радасную долю.

Дык ніхай жа і яны, ідучы к новым і больш мастацкім сцэнічным ідэалам, ні забудуцца аб тым, хто так ні шкадуючы сябе, служыў роднаму пекнаму мастацтву.

Ніхай ні заглушыцца у куточках беларускіх пекная і ўдзячная памяць аб бацьку нацыянальнай сцэны!..

Зыгмунт Абрамовіч.

Слуцк. 1917 г.

Настаўніцкая сэмінарыя.
(Успамін).

У майго бацькі было шэсьць сыноў. Зямлі мы мелі 13 дзесяцін. Калі-б падзяліць гэтую зямлю на шэсьць частак, дык ані водзін ні меў-бы хлеба. Праз гэта бацькі навучылі другога сына шавецтву, а мяне, чацьвёртаго, згадзіліся аддаць ў настаўніцкую сэмінарыю, каб быў настаўнікам і меў, як думалі яны, лёгкі хлеб. Напэўня яшчэ хацелі зрабіць з мяне пана.

У сэмінарыю прыймалі натта мала: з 200 хлопцаў здавалі экзамін ледзьвя 50, ды і тых за чатыры гадэ так прасевалі, што канчалі навуку адно якіх 10—15 чалавек.

Бракавалі задачамі з рожнымі выкрутасамі, літараю ѣ, а найбольш бракаваў доктар. І гэта ні ўледзючы на тое, што шмат здаровых хлопцаў паступалі ў сэмінарыі дзеля таго, каб іх ні ўзялі у маскале.

Калі я ўспомню цяпер гадэ, пражытыя у сэмінарыі, дык у мяне скура шэрхне. Гэта была ні то казарма, ні то манастыр, а лепій сказаць і то і другое разам. Разам з Набеданосцавым, меў велькі уплыў і поп, што выкладаў Закон Божы. У прыгатавіцельным клясі мы вучылі біблію па-славянску блізка на памяць. Я знаў блізка ўсе парамії, размовы Хрыста і т. д. на памяць. Рана і вечарам чыталі ўсе пацяры, стаўшы ў рады. Перад лекцыямі чыталі евангеліе. Набажэнство у дамовай цэркві слухалі так сама, стоючы у радох, ні можно было ані выставіцца ўперад чы ўзад, ані адставіць ногу, калі забаліць. Калі што, дык падходзіў дзежурны настаўнік ды казаў: «Что, у тебя ковинец в ногах?». Блізка палавіну абедні трэба было выстаяць на каленях. Цалаваць крыж падходзілі мы чаргою, як гусі, і пасьля крыжа цалавалі папоўскую руку. Адно раз ў год, пасьля прычасьця, ні трэба было цалаваць рукі попу і стаяць на каленях, бо мы праз прычасьце, як гаварылі нам, злучаліся з самым Збавіцялем. У нядзелю гавецня мы выстойвалі на каленях ў цэркві ўсе службы, а на кватэры ў інтэрнаці ўсе малітвы. Гэта была нядзеля плачу на «рѣках Вавилонских». Як яна праходзіла, дык так станавілося лёгка на сэрцы, як бы які ціжар спадаў.

Танцаў, чы якога спорту, ні то што ні вучылі, але яшчэ іх забаранялі. Поп ўселяк хацеў ўбіць пела вучняў, каб даць прастор духу. Перад абедняю да якоі першае гадзіны, нічога ні давалі есьці. Усе пастэ мы пасьцілі. Пасьцілі і Пятроўку, хаця ж ад экзаміна ледзьвя хадзілі,—так мізарнелі. Ні праходзіло таго году, каб адзін альбо два сэмінарысты ні памёрлі ад сухотаў. А, тым часам, дырэктар на пэдагогіцы вучыў, што «у здаровум целі здаровы і дух». Гэты дух разам з целам ён хацеў выцьвічыць пры помачы гімнастыкі. Многа часу прападало на тое, каб пісаць, малеваць славянскімі літэрамі.

Сэмінарыя мела мэтаю выпускаць абрусіцеляў. Дзеля гэтага ўсё, што магло б напомніць аб Беларусі, абходзілося. Гісторыю Літвы мы вучылі, але нам гаварылі, што ў Літоўскім князьстві дзяржаўная мова была руская [а ні беларуская] і на ёй пісаліся законы, як напр., Літоўскі статут. З гэтаю мовою нас ні знаёмілі. Адкуль магла быць на Літве руская мова, калі да Ломоносова гэтае мовы і у самых расійцаў ні было, гэта аднаму Богу ведама. Якая была і ёсьць ў нас літэратура, аб гэтум маўчалі, як вады ў рот набраўшы. А можна было пазнаёміць з Літоўскім статутам, з песьнямі Чачота, з вершамі Марцінкевіча і т. д. З географіі мы зналі адно аб зубрах белавежскіх. Якія замкі на Беларусі, як жылі магнаты, як ішло жыцьце беларусаў, таго ні выкладалі.

Вучыцель гісторыі, географіі і естествазнанння гаварыў нам, што Расія вельмі дужая і што яе флёта мацнейшая, за ангельскую, бо «збудована па астатняму слову навукі». Адно Японская вайна сказала нам праўду. Параўнання Расіі з заходнімі панствамі ў эканамічнум і ў фінансовум стасунках ні рабілося. Такім парадкам, махлярствам і моўчкамі, хацелі зрабіць нас патрыотамі. Само жыццё ўсё гэта параскідало, як веняр хатку с картак.

Вуцыцель рускае мовы быў букваедам. Даволі было вучвю праз абмылку напісаць адно е замеж ѣ, каб алтрымаць за дыктант і за ўсю расійскую мову 2. Трэба было адказываць слово ў слово па кнізі. А калі вучань трошкі іначэй адказваў, дык ён казаў: «А, братец ты мой, возми книгу, прочитай, развѣ там так?» Каб навучыць нас расійскай вымове, ён прыказваў вучыць слова с «р» і вымаўляць іх цьвёрда, чы мягка [у нас заўсюды вымаўляецца цьвёрда]. Напрыклад: царь, царя., государыня, ура і т. д. Адказывае вучанік па-рускай мові. «Что ты еще училъ?»—«Училъ выговаривать слова съ буквою р.—«Скажи?»—«Цара, уря, барыня», гаворыць вучанік. «Ах, братец ты мой! Это он так учил слова с буквой «р». Ступай на мѣсто, я ставлю двойку». Яшчэ было другое цьвічэнне на ф. Мы гаворым: кароў, валоў, а трэба было гаварыць па-расійску: кароф, валоф і т. д.

Бібліотэка у сэмінарыі была надта бедная. Яна навят ні ыела крытыкаў: Белінскаго, Пісарева, Боголюбова, Михайловскаго і інш.

Матэматыку, на каторой найбольш можна было б развіць лагічнасьць змыслу, прыходзілося так сама браць праз зубрэнне. Як мужыцкіх дзяцей нас, называлі на «ты». Калі спаткаў настаўніка, дык за поўверсты зьнімаяш шапку і ідзеш з голаю галавою, хоць вецер, хоць мароз.

У інтэрнаці трымаўся строгі парадак. У горад выпускалі на вельмі кароткі час і то з дазволу дзежурнаго настаўніка, каторы за сваім подпісам выдаваў картку. Але «общественности» сярод вучанікоў ні было ніякае. Аднак дырэктар любіў паказаць, што яго выхованцы маюць «общественный» дух. Аднаго разу быў пажар. Вучні памагалі тушыць. Мешчане злажылі грошай рублеў са 30 на карысьць сэмінарыі. Дырэктар склікаў вучанікоў і кажа, што добра было б купіць на гэтыя грошы партрэт Александра III. Ніхто ні мог быць спрэчным. Тагды дырэктар выбраў двох дэлегатаў,—здаровых мужчын, і паслаў іх да паліц. прыстава з рапортам, што нібы-то вучанікі згадзіліся самі купіць партрэт і аб гэтум даносяць «Его Высокоблагородію».

Рабілі мы раз гімнастыку на двара, разам ўсе клясы. Камандаваў намі ефрэйтар, а дзеці настаўнікаў крычалі нам: «аслы, балваны, ідіоты». Іду я посьля гэтага с таварышам па скверу, каторы рое па пяску, і мы многа працы ўлажылі на тое, каб тут што нібудзь расло. Бачым, сын настаўніка пагнуў вяршок маладога клёну і ломіць яго. Таварыш хацеў урэзоніць хлопца, але быў за гэто аблаяны. Бачу я, што з разпустам нічога ні зробіш, і ўзяў яго за вухо. Хлопец быў адзін сын ў мацяры. Як ён заплакаў, дык бацька прыбег ні знайшоў мяне, ды крычыць: «гдѣ ты хам? гдѣ ты хам?»

Есьць нашая прыказка: «ні дай Бог з мужыка пана;» А гэтыя панэ настаўнікі былі з мужыкоў, ды яшчэ з мужыкоў абрусеўшых.

Сэмінарыя адарвала мяне ад народу. Я быў як бы чужы паміж ім. Працуючы над асьветаю і адраджэннем свайго народу, я зноў злучаюся з ім і вартаюся да дому...

А. Даніловіч.

ПА БЕЛАРУСІ.

З Могілёўшчыны. У Мецісляўлі выдаецца «Мстиславскій Голос.» Кірунак с.-рэвалюцыйны с прыкметным тутэйша-беларускім выглядам.

— У Горках друкуюцца дзьве газэты.

Новы, хітрэйшы пасьянс раскладае:
—Любіць, ні любіць, любіў, ашукаў,
Верным астаўся, ці ім ні бываў?

Рыпнулі дзьверы... І вось на парог...
Паннечка—зірк!—гэтаж ён, далі Бог!
Палец да губ прылажыў, усьміхнуўся,
Дзьверы прымкнуў за сабой, азірнуўся.
— «Панна чакала, каб я, ды-й вярнуўся?»
Ціха на пальчыках к ёй падыйшоў.
Дзеўча адразу ні знойдзе і слоў.

Потым зьдзіўленне крыху адыйшло.
— «Скуль пан узяўся і што прывяло?»
Гэтак пытае.—«Урода ассанны.
Сам, як ягнятка, ласкавы, рахманы.
— Жыць ні магу без каханае панны!
Мусіць нігдзе ні спаткаю такой...
Дай ты мне шчасьце, вярні мой спакой».

Рукі злажыў і на коленкі стаў,
К ножкам дзеўчаці галоўкай упаў.
Панна Эмілья, смуціўшыся гэтым,
Хоча устаць, адхіснуцца, а дзе там!
Ен ні пушчае і моліць ўсім сьветам:
«Будзь гаспадыняй, царыцай маёй,
Сэрцо зьлячы мне, душу заспакой».

Што тут рабіць? Гэта-ж могуць пачуць,
Потым у вочы усе засьмяюць:
Панна у ночы госьцяў прымае!
Ручкай гусара с кален падымае;
Просіць устаць, ні крычэць, суніме,
Садзіць у крэсла, прыносіць вады...
— «Ціха, мой пане, наробіш бяды!

Людзі пачуюць,—нічога табе,—
Сеў дый паехаў, і сам па сабе.
Я-ж і на заўтра тут мушу астацца:
Будзе ад сораму недзе схавацца.
Людзі пачнуць як навокал сьмеяцца:
«У панны Эмілі ёсьць кавалер.»
— Хай ні сьмяюцца! Бо плакаць, павер,

Будуць, панечка, яны над сабой,
Покуль гуляю яшчэ з галавой,
Покуль ні судзіць мне доля прапасьці.
Хіба сама ты захочаш напасьці,
Думкі ні споўніш маёі аб шчасьці.
Ведай: прыехаў забраць я цябе,
У разе-ж нізгоды—застрэліць сябе.

Бачыш, кладу я на стол пісталет:
Коркі падняты, набоі, як сьлед.
Добрая гэта турэцкая штука!
Дзед адабраў на вайне ў мамэлюка;
Можа сягоння прыдасца на ўнука.
Воля твая: разсудзі, выбірай,—
Шчасьцем дары, ці на сьмерць пакарай.

— «Пан ні даеш мне с чаго выбіраць,
Я ні хачу ні судзіць, ні караць!
Як-жа так раптам... ці ж можна, скажэце?
То-ж ні гульня, а мы с панам ні дзеці,—
Трэба падумаць яшчэ, наглядзеці...»
— Панна Эмілія, мне ні пярэч!
Хіба ні любіш?.. —Ні панская рэч!

Пану да гэтага дзела міма,
Ведаю думкі свае я сама.
Можа-б любіла, каб гэтак ні ягліў,
Так ні цужаў і з адказам ні наглiў,
Быў да паненак ні гэтак павадліў,
Можа-б тагды і пайшла...» —«А цяпер?!»
Панна зьбляднела, маўляў, бы, папер;

Хоча сказаць і баіцца сказаць,
Вочкі спусьціла, павекі дрыжаць...
Той жа гусар, як смала прычапіўся,
Ручку цалуе і с крэсла ўсхапіўся,
Зноў на каленях у ног апынўся.—
—Слонейко,—просіць,—кажы, ні чакай:
У пекла мне судзіш, ці разам у рай?

Любіш—ні любіш, шкадуеш, ці не,—
Дай жа спакою, ні мучай мяне.»
Сэрцо паненскае, ведама, з воску,
Возьмем мы место, ці зьвернемся ў вёску.
Толькі-б агоньчык і зараз-жа сьлёзку,
Ясную сьлёзку на вочка нашле.
Хоча, ні хоча ды й скажа «але.»

Гэтак і с паньяй Эмільяй было.
Нешта ад сэрца к грудзям падыйшло,
Потым у горле клубком перасело,
Бытцам-бы выскачыць сэрцо хацело:
З вочак сьлязінка скацілась нісьмела,
Сьледам другія сьпешаюць ісьці...
—Люблю,—кажа [панна: люблю... адпусьці!

Ускочыў, падскочыў гусар малады,
Так, як бы чорт ад сьвянцонай вады.
Рады, сьмяецца і ручкі цалуе,
Пусьціць, абніме, ізноў прымілуе,
Ну, ні раўнуючы, моро хвалюе,
Нават апомніцца ёй ні дае,
Рупіць зьбірацца, капоцік ўзьдзяе,

Гасіць лаёўку, вядзець на парог,
Клямку шукае... Ды Бог засьцярог:
Панна зірнула каханку ў вочы,—
Так як вугольля, гараць сярод ночы...
Верыць—баіцца, ні верыць—ні хоча.
—Хто тут?—пытае. Ен цягне, маўчыць...
Панна ў трывозе тады як ўскрычыць:

— «Маці Прачыстая! У помач прыдзі!
Згінь ты, шатане, мара, прападзі!
Згінь, прападзі ты, нічыстая сіла!»—
Правай рукою яго ахрысьціла,
Чуе: рука, што трымала, пусьціла.
Прывід той страшны прапаў ў цемнаце:
— Кінь варажыць ў адвэнтовым пасьце!—

Голас чужы з-за дзьвярэй прагрымеў.
Панна прачнулась. Ліхтар абгарэў,
Мусіць даўно дагарэла лаёўка,
Смрод у сьвятліцы... баяела галоўка.
Ціха праз сені прайшла пакаёўка.
Стары гадзіннік паказвае пяць...
— Ах, як заспалася!... Трэба-ж так спаць!

1914 г. Алесь Гарун.

«Изв. Гор. Сов. раб. и Крест. деп.» Редактуе Хрысаненкоў, кандыдат ў Учр. Сабр. ад с.-р.

«Горецкій Вѣстникъ» —газэта безпартыйная. Есьць стацейкі проці беларускаго руху Г. Цытовіча, цікавыя толькі поўнай нісьвядомасьцю па агульна-нацыянальнаму і беларускаму пытанню (напр.: украінцы—нацыя, а беларусы не; у беларусаў нічога німа, бо Цытовіч шукаў чаго-якога «солидарнаго» (?) аб Беларусі у Могілеўскай беларускай кнігарні і нічога ні знайшоў і г. д.) У абарону ніпэ нейкі пічыры «сын Маці Беларусі.»

=Сьпісак с.-рэволюцыанэраў ідзе ў губэрні пад № 1. Спачатку Аўксенцьеў, Коварскі і Рапопорт. Потым свае тутэйшыя, малавядомыя. Сярод грамады селян сьпісак зьбярэць найболі галасоў. На зьездзі селянскіх дэпутатаў на Пакровы ў Магілёві с.-рэвалюцыанэры здалелі забраць селян у свае рукі. Агітацыйная літэратура с.-р. пашыраецца праз старастаў. У самай захалустнай вёсцы налеплены іхныя сьпіскі і праклямацыі. Аднак ні падабаіцца нашым селянам ураўнітэльна-трудавое карыстанне зямлёю, і перадзелы. Дык на пытанне: «Чаму вы за с.-р.?» адказываюць: «А за каго яшчэ? Мы нічога ні ведаем... Уся воласьць ужо згодзілася, ні варта разьбіваць галасы... Ніхай сабе, а тады зямлю мы самы разміркуем, як нам лепі...» і г. д.

Сьпісак с.-дэмакратаў (меньш.) і «Бунда» ідзе пад № 2. За зямельнае пытанне ён падабаіцца селянам больш за 1-га. Яго пашырэнню шкодзіць блок з «Бундам» і замалая агітацыя.

А беларускім сьпіску у Шамаўскай воласьці ёсьць толькі слабыя чуткі, што ён ідзе пад № 8.

Шмат хто с селян—уласнікаў, пабачыўшы праклямацыі сьпіска № 2 і чуючы нарэканне на свой сьпісак, як панскі, прылучаюцца да № 2.

Мястэчковыя жыды галасуюць за нацыянальныя сьпіскі. потым за с.-р., с.-д. і дайжэ—за кадэтаў!

Салдаты, прыходзячы ў водпускі, агітуюць за большэвікоў. Праўду кажучы, агульны настрой селян—нісьвядома-большэвіцкі.

=Пачатковых школ настаўнікі і настаўніцы ужо рыхтуюцца пачаць на лета навучанне па-беларуску.

=У Горках гурток вучнеў-беларусаў налічаіць больш паўсотні хлапцоў. Здаецца, 21/XI гурток дае «Беларускі вечар.»

=Прэдседацель Мсціслаўскага зямельнаго камітэту с.-р. Клімчынскі «змагаўся з анархіей.» Прыехаў да пані Г., сеў сам і пасадзіў сваіх казакоў на панскія коні і паехаў па лясох да селян—дравасекаў. Казаў, што ён да часу камісар павету і што, па загаду Часовага Ураду, прыказывае купляць дровы у паноў плоцючы у камітэт. Тым часам «соглашенія с владельцами» ніяк ні выходзіло, і селяне у вочы казалі Клімчынскаму, што ён ні камісар, а панскі прыказчык, калі дагэтуль ні апрацаваў пляну, гдзе, каму, скольгі і па якой цане браць дровы, а толькі езьдзіць с казакамі ды крычыць аб «соглашеніи.» У вёсцы Бялі казакі пабілі за дровы селяніна. Посьля скандалу с салдатамі, ці-то пачуўшы аб здарэннях у Петраградзі, казакоў некуды вывялі. Зьехаў у горад і Клімчынскі, пабяцаўшы адвесьці вучасткі на дровы. Селяне і дагэтуль таго адводу ні бачуць і пачалі працаваць самі, зьнізу. Вясковыя зямельныя камітэты зьбіраюць сходы, запрашаюць члена валастнога зямельнаго камітэту і выносюць пастановы: гдзе браць дровы і лес на рэмонт, колькі каму, па якой цане і г. д. За усім пільнуе, выдае квіткі і бярэ грошы камітэт. Ен жа уходзіць у зносіны с суседнімі камітэтамі, даносіць паветовому камітэту і г. д. Адным словам праз п. п. Клімчынскіх селяне пачалі рабіць зьнізу усё тое, што цяпер большэвікі блогаславілі і падалі арганізацыі зьверху.

С Курманава селянамі быў выселен за 10 вёрст, яшчэ с пачатку рэвалюцыі, панскі акружны ляснік Васіль Бык, які пры старых парадках біў селян бізуном і усяк зьнушчаўся. У часе налёта камісара Клімчынскаго, зьявіўся і той Бык, мусі зразумеўшы ўсё па-свойму: у лесі пачаў езьдзіць, пісаў колькі хто дроў вывозіў і нібо-то некаму с селян сказаў: «цяпер вазіце, а цераз год я ізноў паеду на вас туды, куды забажаю.» Надоячы Быка нехта забіў у яго хаці са стрэльбы праз шыбу у вакне.

Лес пільнуюць самі селяне. У лесі «Багацькаўшчына» яны паламалі калёсы аднаму селяніну, што хацеў украсьці лес без дазволу камітэту.

Падарожны.

Хто робіць пагромы на Беларусі? Начальнік штаба глаўнакамандуючаго у тэлеграмі на імя Мінскаго губ. камісара зазначае, што аграрныя ніпарадкі, пагромы, грабежствы і гвалты чыняцца салдатамі. Усе, хто добра знаёмы з вёскаю, сьведчаць, што нашы селяне самі ніколі ні адважыліся-б на такія злачынства. І цяпер яны толькі карыстаюць с пагромаў, а самі ні ушчынаюць.

Пагромы ў паветах. У Мінск штодня надыходзяць весткі аб пагромах у паветах. На пачатку лістападу разгромляны і часткаю папаляны маёнткі: «Глінін» на Барысаўшчыні, «Грушына» на Ігуменшчыні, «Слабодка» на Барысаўшчыні, «Труханы» на Новагрудшчыні, «Тарахомск» на Піншчыні, «Калюніца» «Крушчына», «Камокі» на Ігуменшчыні. У некаторых выпадках пагромы канчаліся гвалтоўніцтвам над гаспадарамі. Разгромы рабілі салдаты поруч с селянамі. 5-го лістапада салдаты і селяне разграмізі маёнтак «Нарцэвічы» на Ігуменшчыні гр. Чапскае.

Па апошнім весткам у Ігуменскім павеці ідуць сплашныя пагромы, разгромы і грабежствы. На Барысаўшчыні разгромлены маёнткі: Зарэчча, Лісін, Бароўляны, Бузонкі, Казіміраво, Скуплін і др.

Па наказу глаўнакамандуючаго на Ігуменшчыну і Барысаўшчыну паслалі войско.

Покліч да Беларускае Рады. Слуцкі паветовы камісар зьвярнуўся да Рады з гэтакой тэлеграмаю: «Становішчо у павеці труднае. Прышлы элямэнт з Валогды, Вяткі, Костромы і інш. м. уселякімі абецанкамі верадуюць маласьведомыя, а то і саўсім нісьвядомыя масы. Пачаліся пагромы маёнткаў салдатамі, разгромляны хвальбаркі: Малево, Альба і Робертаво, што каля Нясьвіжу. З Слуцкае Рады с. і р. дэпутатаў павыходзілі ўсе мейсцовыя людзі, прэдстаўнікі усіх соцыялістычных партый, засталіся большэвікі. Яны склікалі т. з: селянскі зьезд, нівядома праз каго дэлегаваны. На гэтым зьездзі ухалено арыштаваць камісара Астроўскаго, начальніка міліцыі Асьвецімскаго і др. ўсіх сябрукоў беларуск. сацыяліст. грамады. Покі што мы ні арыштаваны і пастановам безадпаведальных людзей ні скарымся, калі ні будзе ужыта фізычнае сілы.

Наша думка: Вялікая Беларуская Рада павінна нібаўна узяць уладу ў краю у свае рукі, бо на працінны выпадак, знішчацца усё культурнае багацце краю.» Слуцкі камісар.

м. Лунінец. 9-го лістапада губ. камісарыят адтрымаў тэлеграму з Лунінца, што разгромлены маёнткі: «Маньковічы» кн. Радзівілла і «Лунін» кн. Друцкаго-Любэцкаго.

Апошнія навіны.

Дыктатура Леніна—Троцкаго. Інтэрнацыялістычная «Новая Жизнь» і ліваэсэроўскае «Знамя Труда» згодна тлумачаць раскол сярод большэвікоў і кажуць, што гэта разгартае новую страніцу у расійскай гісторыі—страніцу дырэкторыі Леніна і Троцкаго. Гэта ні дыктатура «Совѣтов», але і ні дыктатура большэвіцкае партыі. За Леніным і Троцкім, апрач нішчаснаго Луначарскаго, німа больш ніводнаго дзеяча, імя катораго хоць што-небудзь гаварыло-б краю. З імі адна падашуканая, асьлепляная абецанкамі маса, каторая зьменшаецца с кожным днём, паводлуг таго, як перад ёю расчыняецца сэнс авантуры. Так кажа Суханоў у «Нов. Жизни».

Дыктатура большэвікоў ні можа прадтрымацца доўга. Новая дыктатура ужо ні партыі, а асобаў, ставіць у агромністую нібезпеку усе заваёвання работніцтва і селянства. Мы ужо бачылі да якіх скуткаў прывела дыктатура Керэнскаго. Дыктатура Леніна і Троцкаго прывядзе да поўнаго зніштэння усіх нашых вольнасьцяў. Трэба памятаць, што дыктатура варочае нас к царызму. У адказ на тэрор, каторы прымушан будзе рабіць Ленін, пойдзе адказны тэрор. Гэта ніухільна будзе, бо гвалт выклікае гвалт.

Арэшт В. Пурышкевіча. Арыштован вядомы манархіста Пурышкевіч з братамі. У яго адабралі ліст ад генэрала Каледзіна. Кампанія Пурышкевіча рыхтавалася пасадзіць на царство цара. Згавор шырока быў арганізованы.

Пурышкевіч арыштован на кухні у хвартусе і лёкайскай вопратцы. Яго пазналі па панскіх камашах. Даведаўшыся, што прышлі салдаты яго арыштаваць, ён пераапрануўся у вопратку лёкая і доўга сьвяціў салдатам і паказваў, што трэба, покі тыя рабілі обыск у яго кватэры. Ніхто тагды ні мог яго пазнаць і толькі нарэсьці знайшлі яго на кухні.

Мірныя пераговоры. Рада народных камісараў наказала вярхоўнаму глаўнокамандуючаму зьвярнуцца да ворагоў с пропазіцыяй аб установленні нібаўнаго замірэння дзеля таго, каб распачаць сталыя пераговоры а міру.

Троцкі зьвярнуўся да паслоў хаўрусных з намі дзяржаваў с прапазыцыяю гэтак сама нібаўна абвясьціць замірэнне і пачаць мірныя пераговоры.

Керэнскі і Коледін. Казацкі Вайсковы Урад на Доншчыні, на чале якога стаіць Коледін, паслаў Керэнскому запрошэнне ехаць на Доп; тут Коледін падтрымае Керэнскаго са усім сваім казацкім войскам. Тут заснуецца Часовы Усерасійскі Урад с Керэнскім на чале.

Рэзалюцыя нацыянальнаго блоку XII арміі. (Злучанае пасядзэнне украінскаго, беларускаго, літоўскаго, эстонскаго, польскаго, мусульманскаго выканаўчых камітэтаў 1 лістапад. 1917 г.) Абмяркаваўшы сучасны палітычны момэнт у зьвязку с падзеямі на фронтах і у Петраградзі ухвалілі вымагаць ад улады, якая у гэты час арганізуецца у Расіі, нібаўно здаволіць усе дамаганні нацыянальнасьцяў Расіі, а само:

1) Скасаваць право на грабежство, якое выяўляецца у барбарскай рэквізыцыі у прыфронтавой паласе усіх прадуктоў;

2) Нібаўна нацыяналізаваць войско на фронці і ў тылу;

3) Ні перашкаджаць склікашню Устаноўчых Соймаў народаў Расіі;

4) Абвесьціць, што Расія павінна быць фэдэратыўнаю дэмакр. рэспублікай, ні адбіраючы праваў у паасобных нацыяў на поўнае самаадзначэные аж да адлучэння;

5) Нібаўна ужыць усіх заходаў да ліквідацыі вайны с правам кожнае зацікаўлянае нацыі мець свайго прэдстаўвіка на мірным конгрэсі.

Здавольнення вышэй памянёных вымог блок нацыянальных арганізацыяў XII арміі будзе дамагацца усімі заходамі, якія маюцца у яго распараджэнні, ідучы да гэтага нават шляхам рэвалюцыйных выступаў.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавец «Т-во Беларускай Культуры»
Друкарня Н. М. Нахумова (старэйшаго)